УДК 947.6(04) «18/19» Немцевич

***Міхаіл Стралец,*** *доктар гістарычных навук, прафесар кафедры сацыяльна-палітычных і гістарычных навук Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта; г. Брэст, РБ.*

# КУЛЬТУРНЫЯ ПРАЦЭСЫ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ЭПОХУ Ю. У. НЯМЦЭВІЧА

Юліян Урсын Нямцэвіч выступаў у якасці актыўнага суб'екта культурных працэсаў у 1780-х – пачатку 1840-х гг. Напаўненне рэальным зместам гэтага накірунка дзейнасці ўказанай неардынарнай асобы было па многіх пазіцыях звязана з беларускімі

землямі і таму ёсць сэнс разгледзяць на дадзенай канферэнцыі пытанне, якое поўнасцю супадае з найменнем нашага даклада.

Станаўленне Ю.У. Нямцэвіча як асобы адбывалася ў той час, калі на лёс спрадвечных беларускіх зямель кардынальным чынам паўплываў першы падзел Рэчы Паспалітай, здзейснены ў 1772 годзе. Увыніку дадзенага падзелу тая іх частка, якая знаходзілася на ўсход ад Заходняй Дзвіны, Друці, Дняпра, увайшла ў склад Расійскай імперыі. Астатняя частка гэтых зямель, уключаючы малую радзіму Юліяна Урсына Нямцэвіча, была па-ранейшаму населена падданымі караля польскага і вялікага князя Літоўскага.

«Падзел беларускіх земляў дзяржаўнай мяжой у 1772 г. меў не толькі палітычнае значэнне, гэта быў не толькі падзел на два рэгіёна – захад і ўсход Беларусі, гэта быў падзел на Захад і Усход у сэнсе цывілізацыйным.

Магілёўшчына і Віцебшчына, апынуўшыся ў складзе Расійскай імперыі, трапілі ў становішча далёкай правінцыі... З гэтага часу самаўладдзе становіцца наймацнейшым сістэмаўтваральным фактарам у жыцці беларускіх земляў. Цэнтралізацыя і рэгламентацыя культурнага і грамадскага жыцця, магутная ўлада бюракратыі, характэрная для імперыі, абумоўліваюць пачатак нівеліроўкі сацыякультурных асаблівасцяў рэгіёну.

Сацыякультурнае развіццё заходніх і цэнтральных земляў Беларусі развівалася па іншай мадэлі. Адсутнасць цэнтралізаванай дзяржавы, ярка акрэсленых супрацьлегласцей паміж сталіцай і перыферыяй вызначылі поліцэнтрычнасць культурных працэсаў. Беларускія (літвінскія) землі не былі ў Рэчы Паспалітай на становішчы правінцыі.Яны ўтваралі дастаткова развіты рэгіён, са сваімі гісторыка-культурнымі традыцыямі, дзе было некалькі буйных культурных цэнтраў (Вільня, Гродна), магнацкіх сядзібаў, якія ў часы Асветніцтва сталі асяродкамі інтэнсіўнага культурнага жыцця (Нясвіж, Слонім).» [1, с. 53]

Жывучы на тэрыторыі Заходняй Беларусі, Юліян Урсын Нямцэвіч да 1795 года быў грамадзянінам краіны, у якой Асветніцтва выступала ў якасці вызначальнай рысы ў развіцці культурных працэсаў. Канешне, нельга адмаўляць наяўнасць прыхільнікаў асветніцкіх ідэй у Расіі з ліку сучаснікаў Нямцэвіча,

але яны былі відавочна далёкія ад таго, каб кардынальным чынам уплываць на светапогляд сваіх суайчыннікаў. «На Беларусі... ідэі Асветніцтва знайшлі адлюстраванне ў філасофіі, сацыялогіі, гістарычнай навуцы, літаратуры і мастацтве; вызначаліся паказам бытавых і этнічных умоў жыцця класаў і сацыяльных груп, праблем аўтаномнасці і адносін да Рэчы Паспалітай і Расіі, успрыняцця духоўнай спадчыны мінулага, суіснавання розных пластоў у нацыянальнай культуры. У Асветніцтве вылучаліся розныя класава-групавыя арыентацыі: ад магнатаў (І.Л. Храптовіч) і сярэдняй шляхты да незаможнай і дэкласаванай шляхты (І. Яленскі).» [2, с. 211]

Адным з пераканаўчых доказаў панавання ідэй Асветніцтва ў Рэчы Паспалітай пасля яе першага падзела з'явілася дзейнасць Адукацыйнай камісіі. «Гэта ўстанова, якая была створана ў 1773 г. і праіснавала да красавіка 1794 г., была фактычна першым у Еўропе міністэрствам народнай асветы... Адукацыйная камісія... дала моцны штуршок развіццю культуры і асветы на польскіх (і заходнебеларускіх, цэнтральнабеларускіх. – М.С.) землях.»[8, с. 147] Важна адзначыць, што Ю.У. Нямцэвіч з 1791 года меў дачыненне да дадзенай камісіі ў якасці члена. [6, с. 341] «На тэрыторыі Беларусі Адукацыйная камісія адкрыла акруговыя школы ў Брэсце, Гродне і Навагрудку, якія ажыццяўлялі навучальна – адміністрацыйны кантроль за падакруговымі школамі ў Жыровічах і Пінску (кантраляваліся Брэсцкай акруговай школай). Барунах, Ваўкавыску, Вішневе, Паставах (кантраляваліся Гродненскай акруговай школай), Бабруйску, Беразвеччы, Мазыры, Мінску, Нясвіжы, Слуцку і Халопенічах (кантраляваліся Навагрудскай акруговай школай). Падакруговыя школы ў Драгічыне, Лідзе, Лужках і Шчучыне ўваходзілі ў Піярскую навучальную акругу.

Адукацыйная камісія зрабіла спробу вызваліць адукацыю ад прамога ўплыву каталіцкай царквы. Агульнае кіраўніцтва справай асветы забіралася з рук духавенства. Тэалогія была выключана з навучальных праграм. Школа набывала свецкую накіраванасць. Найважнейшае значэнне надавалася прадметам фізіка-матэматычнага цыкла... Для прывіцця вучням практычных навыкаў уводзіліся асновы геаметрыі, ветэрынарыі,

камерцыі і інш… з гуманістычных навук выкладаліся польская і лацінская граматыкі. Геаграфія. Гісторыя,заканадаўства і інш… Пастаноўка фізічнага выхавання адпавядала задачам падрыхтоўкі моладзі да ўзброенай барацьбы за незалежнасць дзяржавы.» [3, с. 62 – 63]

«Заходняя частка беларускіх земляў выразна апярэджвала ўсход у развіцці выяўленчага мастацтва. Асноўнымі прычынамі гэтага, хутчэй за ўсё, з'яўляліся канфесійная адметнасць дадзеных земляў, наяўнасць тут заможных мецэнатаў і большая глыбіня пранікнення ідэй Асветніцтва. Мясцовая шляхта, лепей адукаваная, больш заможная,чым яе ўсходнія кампатрыёты, стварала хаця і вузкі, але ўсё ж такі рынак для працы мастакоў. Не бракавала тут і дзяржаўных заказаў…

Менавіта захад даў у той час першых свецкіх прафесійных мастакоў, якія працавалі не толькі на мецэната – Ф. Смуглевіча, Ю. Пешку, Я. Рустэма і інш. Усход Беларусі ў гэты час не даў ніводнага імя, якое можна было б паставіць на адну лінейку з вышэй згаданым.» [1, с. 48]

«Другая палова XVIII ст. – час росквіту дэкаратыўнаприкладнога мастацтва Беларусі. Сярод выдатных дасягненняў беларускіх майстроў: посуд урэцкай і налібоцкай шкляных мануфактур, мірскія і слуцкія дываны, карэліцкія габелены і сусветна славутыя слуцкія паясы, што выраблялiся ў радзівілаўскай «персіярні» пад кіраўніцтвам таленавітага Яна Маджарскага.» [10, с. 263]

У прамежку паміж першым і другім падзеламі Рэчы Паспалітай «у развіцці тэатральнага мастацтва на ўсходзе і на захадзе Беларусі… (прасочваюцца. – М.С.) дзве вельмі непадобныя да сябе мадэлі. На ўсходзе (тэатр. – М.С.) застаецца з'явай шляхецкай культуры, выконваючы забаўляльную і рэпрэзентатыўную ролі. Гэта ўсё яшчэ прыгонны тэатр, часам з элементамі школьнага і аматарскага (у Шклове), які цалкам залежыць ад жаданняў уладальніка і, застаючыся з'явай маргінальнай, не ўплывае значна на культурнае асяроддзе. На захадзе Беларусі тэатральнае мастацтва развіваецца імклівымі тэмпамі. Тут тэатр становіцца з'явай паўсядзённага жыцця, ён выконвае не толькі забаўляльную, але і грамадска-палітычную функцыю.» [1, с. 51] Адпаведныя суб'екты культурнага жыц-

ця «удзельнічалі ў агульнаеўрапейскім тэатральным працэсе на ўзроўні еўрапейскіх краін», а ў шэрагу выпадкаў нават ішлі наперадзе іх. Датычыла гэта выкарыстання павільёна ў афармленні спектакля, тэатральных збудаванняў, прыстасаваных для водных феерыяў у закрытым памяшканні, сцэны, якая, рассоваючыся, магла запаўняцца вадой, а акцёры з'яўляліся на лодках. Прадстаўленні балета ў тэатры Казіміра Агінскага ішлі ў час, калі ён плаваў па рацэ Шчары і канале. Вядомы факты, што ў некаторых тэатрах у час спектакля персанажы гаварылі на васьмі мовах.» [7, с. 90]

Рэгіянальныя асаблівасці прасочваліся і ў музычным жыцці. Звяртаючыся да ўсходу, трэба адзначыць, што «вялікім дасягненнем музычнага мастацтва Беларусі другой паловы XVIII ст. з'яўляецца камічная опера кампазітара і вучонага-дамініканца Зябельскай школы-калегіума (Полаччына) Рафаэля Вардоцкага «Апалон-заканадаўца, або Рэфармаваны Парнас». [7, с. 88] Аднак і тут роля захада і цэнтра Беларусі была вызначальнай... Менавіта ... кампазітары і выканаўцы (гэтага рэгіёну. – М.С.) ... пачатак фармаванню літвінскай музычнай школы, у якой вылучаюцца ўжо некаторыя тыпалагічныя адрозненні – вакальна-інструментальныя цыклы, своеасаблівая трактоўка папулярных еўрапейскіх тэм і г.д... Як адну з тыпалагічных рысаў развіцця музычнай культуры на захадзе і ў цэнтры Беларусі адзначым яе пераход да публічнага выканання музычных твораў.» [1, с. 52]

«Адметнасцю архітэктурнага развіцця ўсходняга рэгіёну Беларусі ў гэты час было актыўнае будаўніцтва, рэканструкцыя і перабудова культавых будынкаў. Будавалі ўсе канфесіі – каталікі, уніяты, праваслаўныя. Але толькі апошнія мелі ў гэтай справе дзяржаўную падтрымку... У адрозненні ад усходу, на захадзе і ў цэнтры Беларусі назіраецца ў гэтыя часы буйнае сакральнае будаўніцтва. Архітэктура мае тут пераважна свецкі характар, што, пэўна, тлумачыцца большай ангажаванасцю грамадства ў свецкія справы, а таксама насычанасцю гэтай тэрыторыі такога тыпа пабудовамі.» [1,с. 46, 48] Да ліку цікавых свецкіх пабудоў таго часу трэба аднесці палац Нямцэвічаў у Скоках. Звяртаючыся да гэтага палаца, важна мець на ўвазе суадносіны ўстойлівых і прынцыпова новых момантаў у адпаведным архітэктурным

рашэнні.»Паводле праекта, да 1770-х гадоў у цэнтры вёскі была ўзведзена вялікая двухпавярховая сядзібная хата, накрытая тыповым для французскага барока «ломаным» чарапічным «дахам. ... Асноўнай праявай (новых тэндэнцый у архітэктуры. – М. С.)... сталі вялікія прамавугольныя аконныя праёмы, якія былі першапачаткова абрамлены фігурнымі сандрыкамі... Што ж тычыцца інтэр'ераў сядзібы Нямцэвічаў, то ў адпаведнасці з модай XVIII стагоддзя тут былі арыгінальныя кафлі, насценны жывапіс, а таксама ляпніна». [9]

У апошнія дзесяцігоддзі XVIII ст. у Рэчы Паспалітай стала мацнець грамадская запатрабаванасць на вострыя публіцыстычныя творы. Ю. Нямцэвіч своечасова адчуў гэту запатрабаванасць. «Яго палітычныя памфлеты (вядома больш 100) высмейвалі кансерватызм шляхты, якая трымалася за старыя «залатыя вольнасці» не разумеючы, што яны вядуць да пагібелі ўсю дзяржаву..» [9]

Ю.Нямцэвіч ажыццяўляў свае першыя літаратурныя вопыты ў той час, калі было відавочна, што «у барацьбе з аджыўшымі традыцыямі ў літаратуры перамагалі новыя тэндэнцыі. Відазмянялася жанравая структура: на першы план выйшлі паэзія і драматургія. Амаль знікла духоўная і маральна-павучальная паэзія і расквітнела паэзія камедыйная, бурлескная, якая звяргала старыя аўтарытэты, парадзіравала тое, што раней лічылася недатыкальным, – біблейскія сюжэты: «У Віфлееме доме ўбогім», «Таго дня вельмі слаўнага», «Уваскрэсенне Хрыстова і сашэсце яго ў пекла». Вальнадумства і антыклерыкалізм пранізвалі і парадыйна-сатырычную прозу таго часу: «Прамова русіна», «Прамова русіна аб нараджэнні Хрыста», «Казанне рускае схізнатычнае»... Менавіта камедыйная плынь вызначыла галоўны напрамак развіцця беларускай літаратуры (у гэты час. – М.С.). [10, с. 265] Маючы дачыненне да камедыйнага жанру, Ю. Нямцэвіч пазіцыянуе сябе як прадстаўнік прагрэсіўных сіл. « У 1790 годзе друкуецца яго самы вядомы твор «Вяртанне амбасадара», дзе ў сатырычнай форме высмейваліся асноўныя палітычныя дзеячы таго часу. Пры гэтым у п'есе былі захаваны сапраўдныя прозвішчы персанажаў.» [9]

Пасля далучэння Беларусі да Расіі ў жыцці Ю. Нямцэвіча бу-

дуць час петрапаўлаўскага зняволення, амерыканскі, беларускі, польскі, французскі перыяды. Аднак незалежна ад таго, дзе знаходзіўся гэты дзеяч, ён спадзяваўся на істотны прагрэс у развіцці культуры роднага краю. Ці спраўдзіліся гэтыя надзеі ў 1795 – 1841 гг.?

У гэты перыяд «культура Беларусі развівалася ў новых гістарычных умовах. У канцы XVIII – першай палове XIX ст. у ёй адбываліся сур'ёзныя якасныя змены, звязаныя з неабходнасцю пераарыентацыі, у сувязі з фарміраваннем буржуазных адносін, складваннем умоў для станаўлення буржуазнай нацыі.

Беларусь таго часу не абмінуў агульнаеўрапейскі працэс адноснай дэмакратызацыі культуры. Яе дасягненні сталі даступнымі больш шырокаму, чым раней, колу грамадства дзякуючы развіццю даволі аднароднай і пераважна свецкай адукацыі.» [10, с. 290]

Разам з тым былі рэальнасцю вялікія праблемы датычна моўнага грунту адукацыйнай сістэмы. Да 1830–1831 гг. « на беларускіх землях асвета будавалася пераважна на польскай мове і сюды быў шчыльна зачынены ўваход роднай мове карэннага насельніцтва. На апошняй не толькі не вялося навучанне ў школах, але нават не было арганізавана вывучэнне яе як звычайнага прадмета.» [7, с. 111] Адначасова на гэтых землях адчувалася «саперніцтва польскай і рускай культур» [7, с. 116], уключаючы, зразумела, і асвету. «У супрацьборстве польскай і рускай моў у галіне асветы на Беларусі ... першай наканавана было паступова здаць свае досыць трывалыя пазіцыі.» [7, с. 116] «Асцярожная пры Кацярыне I I, ліберальная пры Аляксандры I , русіфікатарская палітыка стала ў час царавання Мікалая I жорсткай і рашучай». [10, с. 297]

Царызм прадэманстраваў адмоўнае стаўленне да вынікаў працы Адукацыйнай камісіі. «У беларускіх губернях, далучаных да Расіі паводле 2-га і 3-га падзелаў Рэчы Паспалітай, школы Адукацыйнай камісіі існавалі (толькі. – М. С.) да пачатку 19 ст.» [3, с. 63]

«З падзеламі Рэчы Паспалітай і далучэннем Беларусі да Расійскай імперыі храналагічна супадае станаўленне класіцызму ў архітэктуры (беларускіх зямель. – М. С.). У канцы 18 – пачатку 19 ст. створана шмат выдатных палацава-паркавых ансамбляў (Го-

мель, Жылічы Кіраўскага, Радзівілімонты, цяпер вёска Чырвоная Зорка Клецкага, Сноў Нясвіжскага, Залессе Смаргонскага раёнаў, Валожын). У аснову іх архітэктуры пакладзены манументальныя формы антычных ордэраў, сіметрычнасць і ўраўнаважанасць ў пабудове аб'ёмаў і арганізацыі ўнутранай прасторы. У гэты перыяд па ініцыятыве рускага ўрада была ажыццёўлена перапланіроўка многіх беларускіх гарадоў і мястэчак на ўзор рускага класіцызму, часта без уліку рэльефу і гісторыі горадабудаўнічай сітуацыі. У час работы знішчаліся старыя гарадскія ўмацаванні, пашыралася грамадзянскае будаўніцтва па так званых узорных праектах з элементамі позняга класіцызму і несапраўднай готыкі (адміністрацыйныя будынкі, паштовыя станцыі, навучальныя ўстановы). Рамантычны кірунак архітэктуры, у якім пошукі новых форм вяліся праз засваенне гістарычных стыляў, найперш праявіўся ў садова-паркавым мастацтве і палацавым будаўніцтве... Палацы спалучалі класіцыстычную планіроўку і псеўдагатычную трактоўку аб'ёмаў... Архітэктурныя формы розных стыляў спалучаліся пры будаўніцтве шматлікіх сядзібных і сядзібна-паркавых ансамбляў.... Паркі гэтага перыяду набылі спецыфіку эканамічных. Аснову іх складалі даходныя сады з ахоўнымі пасадкамі і маляўнічымі групамі інтрадукаваных раслін.»[4, с. 176]

«Першыя дзесяцігоддзі XIX ст. пазначаны паступовым фармаваннем уласнай прафесійнай школы архітэктуры на базе Віленскага універсітэту. Архітэктура выкладалася тут з часоў іезуіцкай акадэміі... У пачатку XIX ст. архітэктары атрымалі магчымасць праявіць сябе на дзяржаўнай службе.» [1, с. 168 – 169]

«У 1-й палове 19 ст. беларускае выяўленчае мастацтва набывае свецкі характар, развіваецца пад уплывам класіцызму і рамантызму. У творчасці многіх жывапісцаў спалучаюцца абедзве тэндэнцыі... Жывапісцы звяртаюцца да самых розных жанраў: гістарычнага..., батальнага..., бытавога..., пейзажа..., нацюрморта... Асабліва вялікіх поспехаў дасягнулі беларускія партрэтысты... Іх работы прыцягваюць увагу цікавасцю да ўнутранага света чалавека, яго псіхалагічнага стану. У партрэтным жанры пераважаюць рысы рамантызму. У беларускім жывапісе

усё больш адчуваецца імкненне мастакоў да праўдзівай перадачы рэальнасці. У манументальным жывапісе праяўляліся ўплывы класіцызму... і рысы неаготыкі; у графічных творах – класіцызму і рамантызму. З 1830-х гадоў мастацтва графікаў набывае рэалістычныя рысы... Пашыраюцца і віды графікі: станковая гравюра, народны лубок, кніжная граюра, літаграфія... У скульптуры вядучым стылем стаў класіцызм. Яго прадстаўнікі... звярталіся да круглай скульптуры, рэльефу, дробнай пластыкі, стваралі партрэты, рэлігійныя кампазіцыі. Але ў манументальна- дэкаратыўнай і драўлянай культавай скульптуры яшчэ доўга захоўваліся традыцыі барока і ракако.» [5, с. 382]

«У першай палове XIX ст. тэатр Беларусі становіцца камерцыйным. У гарадах і мястэчках актыўную дзейнасць разгарнулі прыватныя трупы. Усталяваўся тэатральны сезон, з'явіліся пастаянныя гарадскія тэатры. Развівалася як аматарскае, так і прафесійнае тэатральнае мастацтва. З'яўленне прафесійнага агульнадаступнага тэатра было выдатнай з'явай у культурным жыцці Беларусі. Гэты тэатр адчыніў дзверы для шырокага кола гледачоў, далучыў іх да здабыткаў сусветнай, польскай, рускай, украінскай драматургіі.» [10, с. 293]

«Музычнае мастацтва амаль не выпрацавала ў гэты час новых форм свайго функцыянавання. Пэўна, да іх належыць далучыць распаўсюджанне музычнай адукацыі, найперш, жаночай, а таксама свецкай, прадстаўленай выкладаннем музыкі ва універсітэце, гімназіі і вучылішчах.» [1, с. 86]

«Першая палова XIX ст. – час зараджэння навуковага беларусазнаўства, якое паўставала як частка славістыкі пад моцным уплывам яе пачынальнікаў П. Шафарыка, В. Бадзянскага, З. Даленгі-Хадакоўскага (А. Чарноцкага).» [10, с. 298] Да адпаведнай сферы меў дачыненне і Ю. Нямцэвіч, які заўсёды выступаў як беларуска-польскі культурны дзеяч. «Жывучы (у 1804 – 1830 гг. –М.С.) у Польшчы, Ю. Нямцэвіч часта ўзгадваў Беларусь, неаднойчы прыязджаў сюды... з мэтай даследавання «нацыянальных помнікаў» Гродна, Слоніма, Навагрудка, Пінска.»[9]

Такім чынам, эпоха Ю. Нямцэвіча «была часам карэннага пераўладкавання ўсіх бакоў культурнага жыцця на беларускіх

землях. З'явы, якія назіраліся ў культуры і грамадстве – Асветніцтва, пачатак складвання сучасных этнасаў; дапаўняліся лёсаноснымі пераменамі ў палітычным жыцці рэгіёну – падзеламі Рэчы Паспалітай. Усё гэта прывяло да супярэчлівасці і складанасці гісторыка-культурнага працэсу.» [1, с. 258]

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Куль-Сяльверстава, С. Я. Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур : Фармаванне культуры Новага часу на беларускіх землях (другая палова XVIII ст. – 1820-я гады) / навуковы рэдактар П. І. Брыгадзін / С. Я. Куль-Сяльверстава. – Мн. : БДУ, 2000. – 260 с.

2. Дарашэвіч, Э. К. Асветніцтва / Э. К. Дарашэвіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 1 : А – Беліца / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мн. : БелЭн, 1993. – С. 211 – 212.

3. Пасэ, У. С. Адукацыйная камісія / У. С. Пасэ // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 1 : А – Беліца / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мн. : БелЭн, 1993. – С. 62 – 63.

4. Архітэктура / Л. А. Базан і інш. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 1 : А – Беліца / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мн. : БелЭн, 1993. – С. 174 – 181.

5. Шапашнікава, А. Дз. Выяўленчае мастацтва / А. Дз. Шапашнікава // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 2 : Беліцк – Гімн / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мн. : БелЭн, 1994. – С. 379 – 383.

6. Нямцэвіч (Урсын – Нямцэвіч) Юльян // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 5 : М – Пуд / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мн. : БелЭн, 1999. – С. 341.

7. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мн. : НКФ «Экаперспектыва», 1996. – 453 с.

8. Краткая история Польши / отв. ред. В. А. Дьяков ; Л. Е. Горизонтов [и др.]. – М. : Наука, 1993. – 528 с.

9. belvirtclub.narod.ru/weekend/270_skoki.htm – 19k –

10. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2-х ч. Ч. 2 / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мн. : Беларусь, 1994. – 527 с.